ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

ХРЭСТАМАТЫЯ

па літаратурным чытанні

4 клас

ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

Хрэстаматыя па літаратурным чытанні

4 клас

Дапаможнік для вучняў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Мінск
«Сэр-Віт»
2021

Чалавек і прырода

Птушкі і звяры, кветкі і дрэвы просяць ратунку ў чалавека: зберажы, захавай, дзе стаіш, дзе жывеш, – хоць на адлегласці погляду, голасу, хоць бы на адлегласці выцягнутай рукі (Д. С. Ліхачоў).

Алена Васілевіч

Геша

– Гэта дзяўчынка?
– Не.
– Хлопчык?
– Не.
– А хто ж?
– Гусяня. Гуска.
– Раскажы.
– Калі будзеш добры і паслухмяны, раскажу.
– Буду.
– Ну, тады слухай.

…Прывезлі Гешу, каб засмажыць на свята. А як развязалі крыльцы, як пусцілі пахадзіць па двары – усім раптам шкада яе зрабілася. Як і ўсе гусі, Геша хадзіла павольна, важна, толькі неяк вельмі смешна налягала на правую нагу і правым крылом заграбала паветра, быццам збіралася падмесці наш двор да свята.

Пакалечылася Геша яшчэ як малая была. Аднойчы Гешына маці, квактуха Чубатка, павяла сваіх дзяцей-гусянят на прыгуменне. Гусяняты скублі маладую траўку, а маці бесклапотна грэблася ў пяску. І раптам, нібы камень з неба, упаў на малых коршак. Гусяняты самі адразу нічога не зразумелі, а перапалоханая маці ад жаху страціла голас. А калі апамяталася і з усяе сілы пачала кудахтаць – коршак з гусянём быў ужо вышэй гумна. Аднак ці то гусяня было занадта цяжкае, ці то трымаў ён яго нязручна,

але малое вырвалася з кіпцюроў коршака і, акрываўленае, пакалечанае, упала ў зялёны бульбоўнік. Там яго і знайшлі. Гусяня адлілі вадой, адратавалі, і яно засталося жыць.

Гэта і была Геша.

Праўда, імя гэтае ёй далі ўжо дзеці нашага двара. Як толькі гуску дасталі з кошыка, усе абступілі яе і пачалі частаваць хто чым меў. Але гуска была на дзіва сарамлівай. На пачастункі яна не квапілася, а толькі коратка дзякавала: «Ге! ге!»

І тады самая маленькая з дзяцей, Наташа, беленькая дзяўчынка з вялікім чырвоным бантам на галаве, затупала ножкамі і запляскала ў ладкі:

– Геша! Геша!

І ўсе дзеці падхапілі ўслед за Наташай:

– Геша! Геша!

Так вось з'явілася ў Гешы імя. А як звалі яе дагэтуль?

Ды ніяк: гусяня і гусяня.

Геша хутка прывыкла да свайго новага імя і адклікалася на яго ахвотна і, як заўсёды, коратка: «Ге!» Дзеці палюбілі Гешу, а яе маленькая гаспадыня Наташа нават есці адна адмаўлялася. І, каб не было слёз, Наташын столік, за якім яна звычайна абедала, цяпер выносілі на двор і ставілі пад старой бярозай. Сюды, пад бярозу, прыносілі місачку і з Гешынай ядой. Звычайна сяброўкі палуднавалі так: Наташа размазвала манную кашу па талерцы і ўсё гаварыла, га-

варыла. А Геша ела моўчкі, чысценька падбіраючы ўсё да крошачкі, і толькі зрэдку коратка зазначала: «Ге!» – згаджалася або пярэчыла Наташы.

А калі Наташу вадзілі гуляць у гарадскі сад, Геша таксама ішла ўслед за ёю. Наташа гуляла ў лялькі, капалася ў пяску. І Геша, нібы дбайная, клапатлівая нянька, не адыходзіла ад яе ні на крок.

Так, у добрым сяброўстве, мінула восень. Настала зіма з маразамі і завеямі. Цяпер Наташу на вуліцу пускалі рэдка. Радзей паказвалася на двары і Геша. Яна сядзела ў цёплым драўляным хлеўчуку. Як і Наташа, яна сумавала па леце, па сонейку, па цяплу. Падысці да акна дома, каб паклікаць сваю сяброўку, Геша не адважвалася: пад вокнамі ляжала высокая гурба снегу. Аднойчы Геша паспрабавала падступіцца, але правалілася па самыя крылы, і яе ледзьве вызвалілі з гэтага халоднага белага палону. Праўда, каб Наташа не сумавала і не плакала, Гешу амаль кожны дзень пускалі на кухню.

– Грэйся! Грэйся! – клапатліва тупала каля Гешы Наташа.– Бачыш, які ў цябе чырвоны нос зрабіўся, як лапкі пачырванелі...

І Геша грэлася, палуднавала і размаўляла з Наташай, як заўсёды, коратка і нешматслоўна: «Ге! Ге! Добра! Цёпла!»

За зіму Геша непрыкметна выросла, і, калі прыйшла вясна, па нашым двары хадзіла ўжо вялікая важная гусь.

Яна ведала ўсіх жыхароў двара. І ўсіх знаёмых яна сустракала і праводзіла да варот, далікатна вітаючыся і развітваючыся: «Ге! Ге!»

Аднойчы Геша знікла. Яе шукалі па ўсім двары, заглядвалі ва ўсе закуткі, пыталіся на вуліцы... Гешы не было. Мінуў дзень, мінуў другі. На трэці дзень пад вечар прыгнаў яе дубцом на наш двор незнаёмы малады мужчына.

– Ваша птушка? – спытаў ён у суседкі.

– Вунь яе гаспадыня! – узрадавалася суседка, паказваючы на Наташу, якая гуляла ў лялькі.

Геша першая ўбачыла сваю маленькую сяброўку.

– Ге! Ге! Ге! – аж тры разы запар крыкнула Геша і, смешна ўзмахнуўшы крыламі, захісталася, запрысядала – подбежкам рушыла да Наташы.

– Гешка! – заплакала ад нечаканасці Наташа. – Мама, Гешка прыйшла! – закрычала яна і кінулася насустрач Гешы.– Ах ты, дурненькая, дзе ж ты прападала? Дзе ты была!..

– Ге! Ге! Ге! – усхвалявана паўтарала Геша.– Сама не ведаю...

А здарылася ўсё вельмі проста. Пасля абеду мама паклала Наташу спаць, а сама апранулася і пайшла да зубнога ўрача. Убачыўшы гэта, Геша вырашыла, што яна павінна абавязкова правесці гаспадыню. На вуліцы ў гэты час было вельмі людна – якраз вярталіся з абеду рабочыя. Геша трапіла ў людскі паток і згубіла гаспадыню. Наташына мама павярнула направа, а Геша павярнула – налева...

Ужо далёка ад дому яна пайшла следам за незнаёмым мужчынам – відаць, не пазнала і палічыла яго за Наташынага бацьку.

У чужым двары яна не знаходзіла сабе месца, і вось на трэці дзень незнаёмы мужчына вырашыў пайсці на пошукі Гешынага дома. І Геша пазнала свае вароты, пазнала свой двор...

– Ге-ге-ге! – раз-пораз задаволена паўтарала яна. – Знайшла ўсё-такі! Знайшла!

– Ах ты, мая разумніца, ах ты, мая залатая! – цалавала Наташа Гешу ў чырвоную дзюбу.

Геша радавалася:

– Ге-ге! І ты залатая!..

Віктар Гардзей

Залаты лістапад

У лясах, на балоце
ліставей,
лістапад.
І стаіць у пяшчоце
залацісты наш сад.

Павуцінай затканы
сенажаці,
лугі.
Лёг на лес, на паляны
сіні водсвет смугі.

Лісце з шэлестам льецца
на траву,
на чабор.
Зелянейшым здаецца
ад святла ціхі бор.

Клін ляціць жураўліны
над зямлёй
наўскасяк.
Заірдзелі каліны.
Пажаўцеў беразняк.

Каля клёнаў барвовых
вецер кружыць лісты.
У гаях,
у дубровах
лістапад залаты.

Уладзімір Дубоўка

Хто дужэйшы

Аднойчы паляшук зімой
пайшоў з сякераю сваёй

у пушчу. Перайшоў ён гаць*.
Зірнуў – аж ля гары стаяць

---

* **Гаць** – насціл з бярвення, галля для праезду цераз балота.

Змест

Чалавек і прырода

Алена Васілевіч
Геша 5
Віктар Гардзей
Залаты лістапад 9
Уладзімір Дубоўка
Хто дужэйшы 10
Клаўдзія Каліна
Красавік 17
Казімір Камейша
Зімовы верш 19
Галіна Каржанеўская
Мышка 20
Якуб Колас
Летам 23
Янка Купала
Вясна 25
Валянцін Мыслівец
Жураўлі і Жураўка 27
Іван Шамякін
Воўк 29

Чалавек і яго род

Эдзі Агняцвет
Слова пра маці 35

Уладзімір Ліпскі
Я. Праўдзівы аповед пра твой і мой радавод *(старонкі з кнігі)* 36
Віктар Швед
Я нарадзіўся беларусам 42
Васіль Шырко
Дзіўны кот *(з кнігі «Дзед Манюкін і ўнукі»)* 43
Васіль Шырко
Шчасце *(з кнігі «Дзед Манюкін і ўнукі»)* 46

Чалавек і Радзіма

Эдзі Агняцвет
Кліча вецер свежы 53
Артур Вольскі
Мой скарб 54
Васіль Жуковіч
Цудоўная краіна 55
Яўген Крупенька
Два словы 56
Георгій Марчук
Як Несцерка французаў перахітрыў 56
Міхась Пазнякоў
Радзіма 60
Міхась Пазнякоў
Заўжды вярнуся 61
Уладзімір Ягоўдзік
Сынковіцкая царква 62

Чалавек, слова і кніга

Пятрусь Броўка
Родныя словы 67
Мікола Арочка
Цяжкое пытанне 68
Анатоль Зэкаў
Дзве мовы..... 68
Пімен Панчанка
Хлебныя словы 70
Юрась Свірка
Словы..... 71
Мікола Чарняўскі
Прыгода з Коскаю *(казка)*..... 72

Чалавек і мастацтва

Анатоль Дзеружынскі
Наш беларускі ручнік 77
Максім Танк
Казка пра Музы́ку *(урывак)*..... 77
Мікола Чарняўскі
Цымбалы 82

Быць на зямлі чалавекам

Рыгор Барадулін
Грамат не хапіла! 87
Іван Аношкін
Ленус-хранікалюс..... 89
Эдуард Валасевіч
Арэх і Жаба *(байка)* 93

Васіль Вітка
Самая дарагая рэч у нашым доме 94
Алена Масла
Цудадзейныя лекі 96
Уладзімір Корбан
Казёл і Муха *(байка)* 101
Уладзімір Правасуд
Вузел *(байка)* 103
Пятро Рунец
Аднойчы вечарам 104
Міхась Скрыпка
Звяглівы Лыска *(байка)* 111

Чалавек і грамадства

Павел Місько
Добры чалавек 115
Кацярына Хадасевіч-Лісавая
Вухуцік 117
Алесь Бадак
Воўк і навука 127
Іван Шуцько
Труцень і пчолкі *(казка)* 129

Чалавек на планеце Зямля

Хведар Гурыновіч
Давайце пасадзім па дрэўцу 133
Язэп Пушча
Белавежа 134
Іван Шамякін
Чорны прамень 137

Лёс чалавека на вайне

Анатоль Астрэйка
Плошча Перамогі 143
Аркадзь Куляшоў
Над спаленай вёскай..... 143
Янка Маўр
Дом пры дарозе *(урывак)*..... 144
Іван Шамякін
Алёша-разведчык 146

Выкарыстаная літаратура 150